УДК 373.5.016:821.161.3.09

А. А. Шкуратава (Горкі)

# ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКІХ УМЕННЯЎ ЯК НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА РАЗВІЦЦЯ МЕТАПРАДМЕТНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ ВУЧНЯЎ

**Аннотация.** У сучаснай школе застаецца актуальнай праблема фарміравання граматнасці чытання, якая разумеецца ў шырокім сэнсе слова як здольнасць навучэнцаў да асэнсавання тэкстаў рознага зместу і фармату і рэфлексіі на іх, а таксама да выкарыстання прачытанага ў розных жыццёвых сітуацыях.

**Summary.** In the current school remains an urgent problem of the formation of reading literacy, understood in a broad sense as the students' ability to comprehend texts of different content and format, and reflection on them, as well as to the use of reading in different situations.

**Ключавыя словы:** чытацкая пісьменнасць, чытацкія уменні, чытацкія навыкі.

**Keywords:** reading literacy, reading skills, reading skills.

Пісьменнае – у шырокім сэнсе слова – чытанне ляжыць у аснове ўсёй дзейнасці чалавека як у перыяд яго навучання ў школе, так і ў будучым. Гэта сукупнасць ведаў, навыкаў і ўменняў, якія пастаянна развіваюцца і ўдасканальваюцца на працягу ўсяго яго жыцця ў розных сітуацыях дзейнасці і ўзаемаадносін.

Выпускнік сучаснай школы павінен разумець тэксты розных відаў, разважаць над іх зместам, ацэньваць іх



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

сэнс і значэнне і выказваць свае думкі аб прачытаным. Мэта настаўніка пры гэтым заключаецца ў прапанове навучэнцам тэкстаў рознага характару, для таго каб увесці іх у сітуацыі грамадскага жыцця, праверыць гатоўнасць удзельнічаць у ёй, карыстаючыся сучаснымі спосабамі прадстаўлення інфармацыі.

Адным з галоўных крытэрыяў узроўню навыку чытання з'яўляецца паўната разумення тэксту. Пра даволі поўнае разуменне тэксту сведчаць наступныя крытэрыі: агульная арыентацыя ў змесце тэксту і разуменне яго цэласнага сэнсу, знаходжанне інфармацыі, інтэрпрэтацыя тэксту, рэфлексія зместу тэксту.

Адукацыйныя дасягненні па павышэнні чытацкай пісьменнасці вучняў уяўляюць сабой, перш за ўсё, асабістыя вынікі: сфарміраванасць цэннасных адносін да чытання; удасканаленне чытацкіх навыкаў; развіццё эстэтычнага густу; фарміраванне развіццёвага кола чытання. Па-другое, метапрадметныя вынікі: уменне эфектыўна выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі; аб'ектыўна ацэньваць дакладнасць і значнасць інфармацыі. Па-трэцяе, прадметныя вынікі: высокі ўзровень засваення матэрыялу, які дазваляе рашаць пэўныя праблемы ў сацыяльнай практыцы; фарміраванне вопыту дасягненяў у сацыяльна значымых відах дзейнасці – алімпіядах, конкурсах, праектах.

Ітак, фарміраванне чытацкай пісьменнасці – гэта неабходная ўмова развіцця метапрадметнай кампетэнтнасці вучняў і асноўны рэсурс у фарміраванні пасяховага чалавека, які ўмее здабываць самастойна новыя веды і паспяхова прымяняць іх у жыцці. Аднак традыцыйныя ўрокі мовы і літаратуры не заўсёды садзейнічаюць фарміраванню менавіта чытацкай пісьменнасці. Ды і тэксты, як у школьных падручніках, дзе вучань ідзе ўслед за ходам думкі аўтараў, звяртае ўвагу на пазначанае курсівам і выконвае заданні пасля правіла ці тэктсу, у жыцці не сустракаюцца.

Чытацкая пісьменнасць патрабуе сфарміраванасці наступных ўменняў: 1) знайсці і выбраць інфармацыю (арыентацыя ў змесце тэксту); 2) інтэграваць і інтэрпрэтаваць тэкст; 3) асэнсаваць і ацаніць (рэфлексія на змест тэксту і яго ацэнка). Названыя ўменні фарміруюцца на ўроках мовы і літаратуры.

Эфектыўнымі прыёмамі фарміравання і развіцця першага ўмення (знайсці і выбраць інфармацыю) з'яўляюцца наступныя:

- Чытанне тэксту з пометамі: на палях па ходу чытання тэксту адзначаць умоўнымі знакамі атрыманую інфармацыю (напрыклад, “+” – я сутыкаўся з такой інфармацыяй, “?” – у мяне ўзнікла пытанне, “-“ – я не згодны з гэтым).
- Гульня “Так – не”: вучням прапануецца загарнуць прачытаны тэкст і адказаць на шэраг пытанняў па змесце словамі “так” або “не”.
- Складанне асацыятыўнага раду да назвы тэксту.
- “Рэшата”: з раду падзей выбраць выбраць толькі тыя, што адбыліся ў жыцці героя ў тэксту.
- “Карэктар”: вучням прапануецца тэкст са скажонымі фактамі, трэба выправіць памылкі.

Уменне другое (інтэграваць і інтэрпрэтаваць тэкст – стадыя асэнсавання) патрабуе ад вучняў знаходзіць такую інфармацыю з тэксту, якая не паведамляецца наўпрост. Гэта здольнасць аналізаваць, ставіць пытанні, прыводзіць аргументы. Для выпацоўкі і развіцця дадзенага ўмення падыходзяць наступныя прыёмы:

- “Рамонак пытанняў”: рамонак складаецца з шасці пялёсткаў, на кожным напісана пытанне. Гэтыя пытанні звязаны з класіфікацыяй узроўняў пазнавальнай дзейнасці: веды, разуменне, аналіз, прымяненне, сінтэз і ацэнка. Пытанні могуць быць простымі, удакладняючымі, інтэрпрэтацыйнымі, творчымі, ацэначнымі, практычнымі.
- “Адзін дзень з жыцця героя твора”: вучні спрабуюць уявіць сябе прапанаваным героем і расказаць аб “сабе”, абапіраючыся на інфармацыю з тэксту.
- “Узаемаапытанне”: адзін са спосабаў работы ў парах, групах. На аснове атрыманай інфармацыі з тэксту скласці актуальныя на сённяшні час пытанні і задаць іх аднакласнікам.
- “Інтэрв'ю з героем”: скласці шэраг пытанняў да героя твора. Пытанні павінны быць асэнсаванымі, карэктнымі, выцякаць з логікі апавядання.
- “Намалюй праблему”: вучням трэба на аркушы паперы намаляваць або схематычна паказаць “вобраз” асноўнай праблемы, узнятай у творы. Прапануецца выкарыстоўваць рознакаляровыя алоўкі.

Выпрацоўцы трэцяга ўмення (асэнсаваць і ацаніць, гэта значыць пракаменціраваць якую-небудзь інфармацыю з тэксту на аснове ўласнага вопыту і згодна са сваімі маральнымі ўяўленнямі, сфармуляваць вывады) садзейнічаюць наступныя прёмы:

- “Сінквейн”. Складаецца па наступнай схеме:

1 радок – тэма твора, якая выражаецца адным назоўнікам;

2 радок – апісанне тэмы двума прыметнікамі;

3 радок – апісанне дзеяння ў рамках тэмы трыма дзеясловамі;

4 радок – фраза з чатырох слоў, якая выражае адносіны аўтара да гэтай тэмы;

5 радок – адно слова-сінонім да першага назоўніка, якое характарызуе сутнасць прадмета або аб'екта.

- “3+2+1”: вучань агучвае тры думкі, якія ён зразумеў; называе дзве справы, якія б хацеў змяніць або здзейсніць; задае адно пытанне, якое хвалюе пасля чытання і абмеркавання тэксту.
- “Кластар”: прапануецца напісаць ключавое слова пасярод аркуша паперы або на дошцы; потым запісваць словы ці сказы, якія асацыіруюцца з дадзенай тэмай (як мага больш); устанавіць сувязі паміж ідэямі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэты педагагічны прыём дапамагае вучням свабодна і адкрыта думаць. Разбіўка на кластары служыць для стымулявання мысленчай дзейнасці да таго, як пэўная тэма будзе вывучана больш дасканала. Гэты прыём дае вучням доступ да асабістых ведаў, разуменню пэўнай тэмы.

- “Тэлеграма”: напісаць коратка – самае важнае, што зразумеў з тэксту.
- “Ліст галоўнаму герою”: у пісьмовай форме звярнуцца да героя тэксту, выказць яму свае адносіны да ўчынкаў, штосьці пажадаць.

Такім чынам, сфарміраваць у вучняў чытацкія ўменні – гэта значыць навучыць іх знаходзіць інфармацыю, правільна яе інтэрпрэтаваць, супастаўляць розныя пункты погляду і, самае важнае, карыстаючыся атрыманай інфармацыяй, складаць сваё меркаванне і аргументаваць яго.

ПРАЕКТ УРОКА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў 7 КЛАСЕ
“ЗМІТРОК БЯДУЛЯ “НА КАЛЯДЫ К СЫНУ”. ТРАГЕДЫЯ ТЭКЛІ”

Тып урока: урок атрымання новых ведаў.

Мэты:
- арганізаваць дзейнасць вучняў па фарміраванні і замацаванні ведаў па тэме;
- стварыць умовы для фарміравання ўніверсальных вучэбных дзеянняў;
- спрыяць выхаванню культуры ўзаемаадносін і супрацоўніцтва.

Плануемыя вынікі:

Прадметныя: уменне чытаць апавядальны тэкст з улікам выяўленага аўтарам пафасу і настрою; уменне вызначаць асноўныя праблемы літаратурнага твора, характарызаваць літаратурнага героя і аргументаваць сваю ацэнку; уменне падрабязна і сцісла пераказваць змест прачытанага, будаваць вуснае паведамленне або развайжанне пра твор.

Метапрадметныя:

Рэгулятыўныя ўніверсальныя вучэбныя дзеянні (УВД): уменне самастойна або з дапамогай настаўніка вызначаць і фармуляваць мэты ўрока; выказваць свае меркаванні; працаваць па калектыўна складзеным плане; планаваць свае дзеянні ў суадносінах з пастаўленай задачай.

Камунікатыўныя УВД: уменне афармляць свае думкі ў вуснай форме; слухаць і разумець маўленне іншых; аргументаваць свае выказванні; удзельнічаць у калектыўным абмеркаванні пытання; выконваць правілы ўзаемаадносін у калектыве.

Пазнавальныя УВД: уменне арыентавацца ў асабістай сістэме ведаў, здабываць новыя веды: знаходзіць адказы на пытанні, выкарыстоўваючы падручнік, свой жыццёвы вопыт і інфармацыю, атрыманую на ўроку; аналізаваць інфармацыю, параўноўваць, абагульняць, ствараць спосабы рашэння праблем.

Асобасныя УВД: уменне праводзіць самаацэнку, супрацоўнічаць з настаўнікам і аднакласнікамі.

| Этап | Плануемы вынік | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў | Сродкі дыягностыкі |
|---|---|---|---|---|
| I.Матывацыя да вучэбнай дзейнасці. | Уменне ўступаць у дыялог і ўдзельнічаць у калектыўным абмеркаванні пытання; уменне афармляць свае думкі ў вуснай форме | Вітаецца з вучнямі, жадае ім поспехаў на ўроку і прапануе прачытаць эпіграф на дошцы. – Як вы зразумелі словы Р. Барадуліна? - Чым для вас зўяўляецца родны дом? – З кім асацыіруецца родны дом? | Вучні жадаюць адзін аднаму поспехаў у вучобе. Услых чытаюць словы на дошцы, тлумачаць сэнс прачытанага. Адказваюць на пытанні настаўніка | Дыялог |
| II. Мэтавызначэнне і арганізацыя дзейнасці вучняў | Уменне фарміраваць мэты і задачы навучання як адлюстраванне асабістых каштоўнасцей; уменне распрацоўваць план дзеянняў, будаваць камунікатыўнае ўзаемадзеянне з настаўнікам і аднакласнікамі | Стварае адукацыйныя сітуацыі для забеспячэння сумеснага мэтавызначэння, пастаноўкі вучэбных задач. З дапамогай гульні “Ці верыце вы, што…” прапануе вучням сцвярджэнні, якія акрэсліваюць кола праблем новай тэмы: - Каляды – гэта радасная падзея? - Бацькі могуць дабравольна аддаць сваё дзіця ў іншую сям’ю? – Дарослы сын можа не пусціць маці на парог свайго дома? | Удзельнічаюць у мэтавызначэнні, асэнсоўваюць асабістыя вучэбныя задачы, удзельнічаюць у сумесным планаванні вучэбных дзеянняў. Разважаюць над прапанаванымі пытаннямі і фармуліруюць мэты і задачы ўрока: пазнаёміцца з апавяданнем З. Бядулі; вызначыць асноўныя праблемы твора; даць характарыстыку героям апавядання. | Франтальная гутарка |
| III. Аперацыйна-дзейнасны этап. 1). Першапачатковае чытацкае ўспрыманне тэксту | Уменне арыентавацца ў змесце тэксту, разуменне цэласнага яго сэнсу, знаходжанне інфармацыі | Забяспечвае ўмовы для рашэння вучэбных задач,суправаджае, кансультуе, стварае навучальную сітуацыю, накіраваную на дасягненне мэт урока. Чытае ўслых тэкст апавядання. Прапануе вучням сачыць за чытаннем і на палях рабіць паметы згодна з усведамленнем інфармацыі. Высвятляе першыя чытацкія ўражанні ад апавядання. Задае пытанні на першаснае ўспрыманне тэксту. Арганізуе гульню “Так-не” на разуменне зместу тэксту | Самавызначаюцца ў вучэбнай сітуацыі, прымаюць і выконваюць пастаўленыя задачы ў працэсе індывідуальнай і калектыўнай работы. Слухаюць тэкст і сочаць за чытаннем настаўніка, адзначаючы на палях свае эмоцыі знакамі “+”, “?”, “-“. Адказваюць на пытанні настаўніка. Выконваюць пісьмова ў сшытках заданні гульні “Так-не”, правяраюць правільнасць выканання пры дапамозе ключэй (на дошцы) | Дыялог, самаацэнка |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| Этап | Плануемы вынік | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў | Сродкі дыягностыкі |
|---|---|---|---|---|
| 2). Інтэрпрэтацыя і інтэграцыя тэксту<br><br>Фізкультхвілінка. | Уменне знаходзіць інфармацыю з тэксту, якая не паведамляецца наўпрост, уменне ставіць пытанні, выпрацоўваць аргументы. Уменне выяўляць і фармуляваць праблему, уменне ажыццяўляць пошук неабходнай інфармацыі, уменне арыентавацца ў сваёй сістэме ведаў. | Арганізуе працэс камунікацыі і калектыўнай мысленчай дзейнасці на ўроку, прадбачыць магчымыя цяжкасці ў вучэбнай дзейнасці і забяспечвае вучняў сродкамі іх пераадолення.<br>Арганізуе дыскусію пры дапамозе прыёма “Адзін дзень з жыцця героя твора”: прапануе вучням уявіць сябе галоўнай гераіняй і расказаць аб сваім жыцці, пачуццях. Звяртае ўвагу вучняў на спосабы раскрыцця вобразаў у тэксце (апісанні прыроды, сугучныя з настроем героя, мастацкія дэталі). | Выконваюць вучэбныя задачы, дасягаюць асабіста-значных сэнсаў пры вырашэнні задач урока; пераадольваюць асабістыя цяжкасці ў вучэбнай дзейнасці; ажыццяўляюць актыўную самастойную пазнавальную дзейнасць.<br>Разглядаюць рэпрадукцыю карціны М. Піманенка “Калядкі”, каменціруюць яе, расказваюць аб гэтым свяце, абапіраючыся на ўласны вопыт. Адбіраюць эпізоды твора, якія дапамагаюць зразумець трагедыю старой Тэклі. Удзельнічаюць у стварэнні карціны жыцця гераіні, аналізуюць яе дзеянні і іх вынікі.<br>Чытаюць і аналізуюць артыкул падручніка “Мастацкая дэталь”. | Франтальная гутарка, дыялог |
| 3). Рэфлексія на змест тэксту і яго ацэнка | Уменне асэнсаваць і ацаніць інфармацыю з тэксту на аснове ўласнага вопыту ці згодна з уласнымі маральнымі ўяўленнямі , сфармуляваць высновы. | Дапамагае вучням усвядоміць асабістую і сацыяльную значнасць вучэбных заданняў.<br>Задае вучням пытанні розных відаў (“тоўстыя, “тонкія”).<br>Прапануе вучням у парах абмеркаваць, а потым запісаць у сшытак тры думкі, якія ён зразумеў, дзве справы, якія б хацелася змяніць або здзейсніць, адно пытанне, якое хвалюе пасля чытання тэксту (прыём “3+2+1”). | Усведамляюць асабістую і сацыяльную значнасць выкананых заданняў, пераадольваюць асабістыя цяжкасці ў вучэбнай дзейнасці.<br>Адказваюць на пытанні настаўніка. Працуюць у парах, а потым самастойна над заданнем настаўніка (“3+2+1”). | Франтальная гутарка, самаправерка |
| IV. Этап інфармацыі пра дамашняе заданне | | Праводзіць інструктаж па выкананні дамашняга задання. Зрабіць кадраплан “Паход Тэклі ў горад. Сустрэча” або напісаць ліст галоўнай гераіне (10-12 сказаў). | Запісваюць заданне ў дзённікі. | |
| V. Кантрольна-ацэначны этап і падвядзенне вынікаў урока | Уменне структурыраваць веды. Разуменне асабістага сэнсу самаацэнкі вынікаў і працэсу вучэбнай дзейнасці, ацэньванне сваёй дзейнасці і яе вынікаў; уменне супрацоўнічаць у працэсе ацэньвання вынікаў дзейнасці. | Арганізуе фіксіраванне зместу ўрока. Абмяркоўвае крытэрыі ацэнкі з вучнямі, ацэньвае працэс і вынікі вучэбнай дзейнасці.<br>-Якую мэту мы ставілі на ўроку?<br>-Ці дасягнулі мы яе?<br>-Прыём “Алітэрацыя”: на кожную літару слова “трагедыя” падбярыце асацыяцыю, звязаную са зместам твора.<br>-Ці сустракаюцца ў сучасным жыцці такія сітуацыі?<br>-Які ўрок вынеслі вы для сябе з прачытанага твора?<br>Выстаўленне адзнак за ўрок. | Адказваюць на пытанні настаўніка. Удзельнічаюць у працэсе ацэньвання і ўзаемаацэньвання вынікаў вучэбнай дзейнасці. | Франтальнае апытанне, дыялог. |
| VI. Рэфлексія вучэбнаў дзейнасці на ўроку. | Усведамленне якасці і ўзроўню засваення ведаў, здольнасць да самаацэнкі. | Арганізуе рэфлексію.<br>-Што спадабалася на ўроку?<br>-Якое заданне было цяжка выконваць?<br>-Ацаніце сваю дзейнасць на ўроку з дапамогай жэстаў. | Складаюць рэфлексіўныя выказванні.<br>Праводзяць самаацэнку сваёй дзейнасці на ўроку. | Дыялог. |

## Літаратура

1. Логінава, Т. У. Беларуская літаратура ў 7 класе: дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюцьатрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел.і рус. мовамі навучання / Т. У. Логінава, Т. І. Мароз. – Мінск : Сэр-Віт, 2005. – 336 с.
2. Снопкова, Е. И. Методологическая культура учащихся в контексте компетентностного подхода / Е. И. Снопкова // Народная асвета. – 2017. – № 2. – С. 7-12.
3. Вальчук, Н. Ад чытацкіх уражанняў – да ўменняў / Н. Вальчук // Настаўніцкая газета. – 2018.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова